## ...тыдні...

Выстава будзе працаваць да 2 кастрычніка.

✓ Сёлета ў верасні Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адзначае сваё 15-годдзе. Гэта знакавая экспазіцыйная прастора, якая за час працы стала яркай візітоўкай НББ. Тут былі рэалізаваныя сотні цікавых выставачных праектаў. Місія Музея кнігі – папулярызаваць і набліжаць да шырокай аўдыторыі ўнікальныя каштоўныя помнікі кніжнай культуры. З нагоды юбілею тут ладзіцца шэраг мерапрыемстваў.

Галоўнай святочнай падзеяй стала адкрыццё **9 верасня** выставы **«5+5+5»**, дзе прадстаўленыя 5 рукапісаў, 5 старадрукаваных і 5 рэдкіх выданняў – 15 сапраўдных рарытэтаў з фондаў бібліятэкі, якія выключна рэдка пакідаюць фондасховішча. Пабачыць іх можна да 24 кастрычніка.

У той жа дзень адбыўся круглы стол **«Музей кнігі. 15 гадоў»**. Адбыліся абмеркаванне ролі Музея кнігі ў папулярызацыі беларускай кніжнай культуры, вылучэнні праблемаў і інавацыйных падыходаў, дыскусія аб перспектывах і кірунках далейшай дзейнасці.

Пры інфармацыйнай падтрымцы навукова-метадычнага часопіса «Выхаванне і дадатковая адукацыя» і партнёрстве кампаніі OZ абвешчаны конкурс **«Музей кнігі – мой музей!»**, што праводзіцца з мэтай развіцця ў дзяцей і моладзі любові да кнігі, творчасці, выхавання гонару за дасягненні і багатыя традыцыі беларускай кніжнай культуры. Узрост удзельнікаў: 6 – 16 гадоў. Прадстаўленне конкурсных працаў да 17 кастрычніка 2021 г. Вызначэнне пераможцаў адбудзецца напрыканцы сёлетняга кастрычніка.



*Фота з партала nlb.by*

*Выстава «5+5+5»*

Да 15-годдзя Музея кнігі і 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі падрыхтаваная выстава вынікаў конкурсу **«Маладыя беларускі экслібрыс»**. Пазнаёміцца з конкурснымі працамі можна да 3 кастрычніка.